**А.В.Няборская,**
*аспірантка кафедры беларускай*
*і сусветнай мастацкай культуры*

# ВОБРАЗ РУСАЛКІ Ў БЕЛАРУСКІХ АБРАДАВЫХ ІГРЫШЧАХ

З усіх славянскіх народаў толькі беларусы маюць найбагацейшы культурны комплекс русальнага тыдня, які ўключае ўяўленні і павер'і пра русалак, абрады іх пошукаў і праводзінаў, карагодна-абрадавую гульню з выбарам русалкай пары, праводзіны пары ў жыта, выкліканне іх з жыта, драматычную гульню ў русалку, тэматычна шырэйшае, чым у суседзяў (украінцаў і рускіх), кола песняў (1).

Да прыходу хрысціянства вобраз русалкі лічыўся адным з важнейшых у славян-язычнікаў побач з такімі вобразамі, як Ярыла ці Кастрама. Русалкі (мясцовыя назвы — купалкі, казыткі) уладарылі над вадой, спрыялі ўрадлівасці глебы, забяспечвалі добры ўраджай. Усе вераванні пра русалак зафіксаваны ў песнях, якія цесна звязаны з каляндарнымі абрадамі і святамі. Галоўнымі ў гэтых песнях з'яўляюцца матывы расліннасці і вады. Вобраз русалкі — адзін з самых цікавых і неадназначных ў славянскай міфалогіі і фальклоры беларусаў. Яго доўгае жыццё ў народных уяўленнях робіць мэтазгодным больш глыбокае вывучэнне звязанага з ім фальклору, вельмі старажытнага па сваёй гісторыі. Цікавасць да вобраза русалкі многіх даследчыкаў (П.Шэйна, А.Афанасьева, Д.Зяленіна, А.Весялоўскага) тлумачыцца рознымі прычынамі, самая галоўная з якіх — неадназначнасць гэтай з'явы.

Варта разгледзець вобраз русалкі ў кантэксце беларускай русальнай абраднасці. Трэба адзначыць, што русалка беларусаў мае шмат агульнага з антычнымі наядамі і дрыядамі, заходнееўрапейскімі ундзінамі, украінскімі маўкамі, паўднёваславянскімі віламі і паўдзенніцамі. Але ж, вядома, існуюць і адрозненні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па-першае, з усіх пералічаных істот толькі русалкі звязаны адначасова і з вадой, і з лесам, і з полем. Таму іх можна лічыць "земнаводнымі" (3, с. 70). Большую частку года — з восені да вясны — яны жывуць у вадзе: азёрах, балотах, але іх галоўнае месцазнаходжанне ў рэчцы, у якім-небудзь глыбокім віры. У гэты час на сушы яны з'яўляюцца рэдка і далёка ад вады не адыходзяць. Толькі пачынаючы з Духавай суботы (памінальнай суботы перад Сёмухай), яны могуць выходзіць на бераг і пасяляцца далёка ад месца свайго жыхарства, у лясах і гаях. У лесе русалкі жывуць на высокіх дрэвах, такіх, як, напрыклад, дуб ці ліпа, але часцей за ўсё яны пасяляюцца на бярозах, дзе гойдаюцца на галінах ці бегаюць па палях, заманьваючы прахожых, якіх заказычваюць да смерці.

Жывуць русалкі і ў густым жыце, і ў гаросе. Дарэчы, яны не любяць ніякае збожжа, акрамя жыта. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў русальных гульнях, якія праводзіліся менавіта ў жытнёвым полі, за вёскай:

Там русалкі ў жыце зялёным сядзелі,
Рана-рана, зялёным сядзелі.
А мой каласочак, як яварочак,
Ран- рана, як яварочак.
У печцы піражком, на стале калачком,
Ран- рана, на стале калачком.

"Русальны (граны) тыдзень" прыпадаў на канец вясны, на час каласавання жыта. Таму ў некаторых мясцовасцях лічыцца, што гэтыя "дэманы-прыгажуні з зялёнымі валасамі сцерагуць нівы (жыта ў прыватнасці), каб дзеці, што збіраюць кветкі, не атрасалі пылку з каласоў, калі жыта красуе" (3, с. 72).

Па-другое, русалкі славян адрозніваюцца ад астатніх німфаў і знешне: яны не маюць хвастоў, як ундзіны, ці крылаў, як вілы. Народ уяўляе іх у вобразе сапраўдных дзяўчын, бледных, маўклівых, з распушчанымі валасамі і вянком на галаве. Часцей за ўсё русалкамі становяцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеці, што памерлі да хрышчэння, самазабойцы і дзяўчаты, загінуўшыя да шлюбу ці адразу пасля замужжа. Якімі б рознымі ні былі гэтыя ахвяры па ўзросце, стаўшы русалкамі, яны аб'ядноўваюцца, так што кожная з іх уяўляе істоту ў пару найлепшага развіцця дзявоцтва: "...гэта жанчына надзвычайнага хараства, з поўнымі расцвілымі грудзямі, з расплеценымі валасамі, прыбраная рознымі аздобамі і прыгожымі сукнямі, вельмі чапурна"(3, с. 72—73). Гэтае апісанне русалкі, зразумела, не адзінае. Часцей за ўсё іх бачылі голымі з вянкамі на галаве ці з кветкамі ў валасах. Вянок у фальклоры — гэта сімвал чысціні і цнатлівасці. Таму русалка ходзіць голая "з вянком на галаве, каб відна было, што яна яшчэ не саграшыла" (3, с. 73). Гэтая варыятыўнасць у апісанні сведчыць аб тым, што русалкі — з'ява, вельмі распаўсюджаная ў Беларусі. Існуе павер'е, што часта побач з русалкамі бачаць дзяцей. Іх прынята лічыць дзецьмі русалак і жывых людзей.

Русалкі маюць ласкавыя блакітныя вочы, якімі ўдала прым ньваюць ахвяру, але, злавіўшы яе, тыя ж вочы становяцца нібы шклянымі і нерухомымі, як у нябожчыка. Па далікатным, амаль празрыстым іх целе рассыпаюцца хвалістыя валасы русага колеру, у асобных русалак гэтыя валасы падобныя на пасмачкі зялёнай тонкай асакі. Дарэчы, доўгія распушчаныя валасы можна лічыць нязменнай прыметай русалак, якая нават увайшла ў прымаўку: "Распусціла валасы, як русалка". А ўжо колер валасоў залежыць ад месцапражывання гэтых істот. Тая, што мае белыя, светлыя валасы, відаць, жыве ў чыстай крынічнай вадзе, а тая, што зяленыя, — у віры, дзе шмат водарасцей, тая, што мае чорныя валасы, жыве — у балоце, куды амаль не трапляе сонечнае святло.

Па-трэцяе, у адносінах да чалавека ў русалак назіраецца дваістасць. З аднаго боку, яны — добрыя духі, звязаныя са стыхіяй вады і расліннасцю, ад якіх залежыць арашэнне зямлі вадой. Таму ў іх гонар праводзіліся асобыя святы: Сёмуха (Сямік), Купала. Наогул, увесь чэрвень праходзіў пад іх знакам.

З другога боку, русалкі – злыя істоты (толькі ў некаторых беларускіх русальных песнях яны добрыя ). Удзень ходзяць па палях і лясах і клічуць да сябе мужчын, шукаючы свайго каханага, непаслухмяных даганяюць і казычуць да смерці. Згубнае ўздзеянне русалак на чалавека мацней за ўсё праяўляецца на працягу "русальнага тыдня" (наступнага за Сёмухай). Ва ўсе дні гэтага тыдня дзяўчаты збіраюцца па вечарах і, як зберагальны сродак ад злых хітрыкаў русалак, пяюць своеасаблівыя песні, якія таму і называюца русальнымі. А ў апошні вечар таго тыдня – русальную нядзелю – дзяўчаты ходзяць у лес і вешаюць на дрэвы вянкі з кветак, упэўненыя, што русалкі іх выкарыстаюць і будуць бегаць па палях і лясах у гэтых вянках. Гэтым прынашэннем яны думаюць іх задобрыць.

Абрады з русалкамі арганічна ўваходзілі ў веснавое свята расліннасці, завяршаючы пераход ад вясны да лета. Таму будзе зразумелым і тое вялікае значэнне, якое надавалі святу ў іх гонар (русаліям) язычнікі. Вядомы гісторык Б.Рыбакоў пісаў, што русаліі з'яўляюцца агульнаславянскім святам, яно звязана з урадлівасцю палёў, маленнем пра дождж і нараджэннем новых калоссяў (4).

Паколькі русалка сімвалізуе пераход ад вясны да лета, таму менавіта вясну ў вобразе русалкі праводзілі напрыканцы "русальнага тыдня", які пачынаўся адразу пасля Сёмухі і заканчваўся на Пятра. Звычайнымі гульнямі, характэрнымі для гэтага свята, з'яўляюцца ваджэнне карагодаў, варожбы (пусканне вянкоў, "чарадзейства" – гаданне па чары з вадой), лоўля русалкі ў жыце, скаканне праз вогнішча, якое лічыцца ачышчальным ад злых духаў.

Ужо ў старажытнасці на тэрыторыі Беларусі былі вядомы дзве разнавіднасці ўвасаблення абрадава-міфалагічнай фігуры русалкі: выяўленчая і тэатральная. Першая рабілася з саламянага куля, насаджвалася на шэст або калок і ўпрыгожвалася вянком з кветак. Гэтае пудзіла-русалку потым "праводзілі" – кідалі ў жыта, спальвалі на вогнішчы ці тапілі ў рацэ. Адначасова спявалі песні (2).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэатральнае ўвасабленне заключалася ў наступным: на ролю русалкі выбіралі найпрыгажэйшую з дзяўчын — тую, у якой былі самыя доўгія валасы. Яе пакідалі ў белай кашулі з расшпіленым каўнерыкам (калі ж яна была смялейшая, то скідала нават і кашулю), упрыгожвалі стужкамі, а на галаву ўскладалі вялізны вянок. Пасля ў карагодзе вялі за ваколіцу, да жытнёвага поля, і там пачыналі розныя гульні. Абрады суправаджаліся песнямі, узмоцненым прытопваннем, стукам. Каб надаць рытм, звычайна ў штонебудзь білі: вядро ці кубел. Гэта адчуваецца ў прыпеве саміх песень.

Як можна заўважыць, каляндарныя народныя абрады, узніклыя ў старажытнасці, паступова трацілі сваё выключна магічнае значэнне. У іх усё больш выяўлялася іграввая аснова. Гэта ўжо невялікія сцэны з акрэсленым сюжэтам, канфліктам, а іх ігравое ўвасабленне ўключае многія аспекты тэатралізацыі: спецыяльны касцюм (пераапрананне ў русалку), рэквізіт, выбар месца.

1. *Беларускі* народны тэатр/ Укладанне, уступны артыкул і каментарыі М.А.Каладзінскага. — Мн., 1983.

2. *Гульні,* забавы, ігрышчы / Склад. А.Ю.Лозка. — Мн.: Бел. навука, 1996.

3. *Міфы* бацькаўшчыны/ Уклад. У.А.Васілевіч. — Мн.: БэлЭн, 1994.

4. *Рыбаков Б.А.* Язычество древних славян. — М.: Наука, 1994.

**А.В.Парфянцова,**
*аспірантка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

## РУКАПІСНАЯ КНІГА Ў БЕЛАРУСІ ЭПОХІ АСВЕТНІЦТВА

Прыярытэт асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы ў XVIII ст. знайшлі адлюстраванне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ